МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

16.09.2026 № 124

г. Мінск

г. Минск

Аб правядзенні конкурсу ў 2026 годзе

На падставе пункта 1 артыкула 17 і падпункта 4.1 пункта 4 артыкула 210 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, падпункта 5.8 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці з 15 верасня 2026 г. па 15 снежня 2026 г. конкурс на стварэнне ў 2026 годзе твораў выяўленчага мастацтва згодна з дзяржаўным сацыяльна-творчым заказам Міністэрства культуры.

2. Зацвердзіць Палажэнне аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу на стварэнне ў 2026 годзе твораў выяўленчага мастацтва згодна з дзяржаўным сацыяльна-творчым заказам Міністэрства культуры (дадаецца).

Міністр М.С.Маркаў

Зак. 569.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
15.09.2026 № 124

ПАЛАЖЭННЕ
аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу на стварэнне ў 2026 годзе твораў выяўленчага мастацтва згодна з дзяржаўным сацыяльна-творчым заказам Міністэрства культуры

1. Дадзеным Палажэннем вызначаецца парадак арганізацыі і правядзення конкурсу на стварэнне ў 2026 годзе твораў выяўленчага мастацтва згодна з дзяржаўным сацыяльна-творчым заказам Міністэрства культуры (далей, калі не вызначана іншае, – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца ў мэтах:

адраджэння, развіцця, папулярызацыі традыцый і дасягненняў нацыянальнага выяўленчага мастацтва;

аздаблення творамі выяўленчага мастацтва інтэр’ераў грамадскіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў).

3. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца Міністэрства культуры, абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты, установа “Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь” (далей – музей).

Канкрэтныя тэрміны правядзення конкурсу вызначаюцца загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, якім зацверджана дадзенае Палажэнне.

4. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца на афіцыйным сайце Міністэрства культуры ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт і змяшчае звесткі аб тэрмінах, умовах і парадку арганізацыі і правядзення конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

5. У конкурсе могуць прымаць удзел прафесійныя мастакі, іншыя творчыя работнікі ў галіне выяўленчага мастацтва, якія маюць прафесійны сертыфікат творчага работніка, а таксама студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі ў галіне выяўленчага мастацтва (далей, калі не вызначана іншае, – удзельнікі конкурсу).

6. Конкурс праводзіцца ў мэтах стварэння ў 2026 годзе 27 твораў выяўленчага мастацтва, прысвечанага Году беларускай жанчыны, для аздаблення інтэр’ераў памяшканняў дзіцячых школ мастацтваў у абласцях і г. Мінску (па чатыры ўстановы ў кожнай вобласці і тры ў г. Мінску), у адпаведнасці з пералікам дзіцячых школ мастацтваў, памераў і зместаў твораў выяўленчага мастацтва згодна з дадаткам 1.

7. Конкурс праводзіцца ў два этапы:

першы – адборачны этап;

другі – фінальны этап, у перыяд правядзення якога ствараюцца творы выяўленчага мастацтва і падводзяцца вынікі конкурсу.

8. На першым этапе конкурсу ў перыяд з 15 верасня 2026 г. па 1 кастрычніка 2026 г. удзельнікі конкурсу накіроўваюць у музей на адрас: 220040, г. Мінск, вул. Леніна, 20:

заяўку на ўдзел у конкурсе па форме згодна з дадаткам 2;

эскіз твора выяўленчага мастацтва, які выконваецца ў матэрыяле, без ужывання камп'ютарнай графікі (далей – эскіз).

9. Матэрыялы, якія прадстаўлены з парушэннем патрабаванняў, прадугледжанных пунктам 8 дадзенага Палажэння, да разгляду не прымаюцца.

10. Выдаткі па стварэнні эскізаў аплачваюць удзельнікі конкурсу.

Структурныя падраздзяленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню, што ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, аказваюць садзейнічанне ўдзельнікам конкурсу ў азнаямленні з краявідамі, капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), дакументамі па гісторыі рэгіёна, неабходнымі для стварэння эскіза.

11. Адбор эскізаў для далейшага стварэння твораў выяўленчага мастацтва згодна з дзяржаўным сацыяльна-творчым заказам Міністэрства культуры ў перыяд з 2 кастрычніка 2026 г. па 9 кастрычніка 2026 г. ажыццяўляе камісія, склад якой зацвярджаецца Міністэрствам культуры (далей – камісія).

12. На пасяджэнне камісіі могуць запрашацца прадстаўнікі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, дзіцячых школ мастацтваў згодна з дадаткам 1.

13. Крытэрыямі адбору эскізаў з'яўляюцца:

адпаведнасць твора выяўленчага мастацтва прапанаванай тэматыцы, памерам і зместу;

высокі мастацкі ўзровень выканання.

14. Рашэнне аб адборы эскізаў прымаецца камісіяй шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў яе членаў. Рашэнне лічыцца правамоцным, калі на пасяджэнні прысутнічала не менш за дзве трэці агульнага складу камісіі. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня камісіі.

Рашэнне камісіі афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня і сакратар камісіі на працягу пяці рабочых дзён пасля дня правядзення пасяджэння камісіі.

15. Спіс эскізаў, адабраных для стварэння твораў выяўленчага мастацтва, публікуецца на афіцыйным сайце Міністэрства культуры

ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт не пазней за пяць рабочых дзён пасля афармлення пратакола пасяджэння камісіі.

16. У перыяд з 10 кастрычніка 2026 г. па 27 лістапада 2026 г. удзельнікі другога этапу конкурсу ствараюць творы выяўленчага мастацтва ў адпаведнасці з эскізамі.

Выдаткі па стварэнні твораў выяўленчага мастацтва аплачваюць удзельнікі другога этапу конкурсу.

Структурныя падраздзяленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню, што ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, аказваюць садзейнічанне ўдзельнікам другога этапу конкурсу ў азнаямленні з краявідамі, капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), дакументамі па гісторыі рэгіёна, неабходнымі для стварэння твора выяўленчага мастацтва.

17. У перыяд з 28 лістапада 2026 г. па 1 снежня 2026 г. удзельнікі другога этапу конкурсу прадстаўляюць творы выяўленчага мастацтва ў музей. Палатно па тарцу мае афарбаванае афармленне.

18. У перыяд з 2 снежня 2026 г. па 15 снежня 2026 г. камісія разглядае творы выяўленчага мастацтва і прымае рашэнне рэкамендаваць або не рэкамендаваць іх да набыцця Міністэрствам культуры за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

19. Творы выяўленчага мастацтва, выкананыя з дабаўленнем элементаў камп'ютарнай графікі або прынта, не разглядаюцца камісіяй і не рэкамендуюцца да набыцця Міністэрствам культуры за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Пры стварэнні твораў выяўленчага мастацтва выконваюцца патрабанні Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 мая 2011 г. № 262-З "Об авторском праве и смежных правах" і іншых актаў заканадаўства.

20. Рашэнне прымаецца камісіяй шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў яе членаў. Рашэнне лічыцца правамоцным, калі на пасяджэнні камісіі прысутнічала не менш за дзве трэці яе агульнага складу. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня камісіі.

Рашэнне камісіі афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня і сакратар камісіі на працягу пяці рабочых дзён пасля дня правядзення пасяджэння камісіі.

21. Творы выяўленчага мастацтва набываюцца Міністэрствам культуры за кошт сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце Міністэрству культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, і перадаюцца дзіцячым школам мастацтваў для аздаблення інтэр'ераў памяшканняў шляхам бязвыплатнай ўступкі выключнага права.

Дадатак 1
да Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу на стварэнне ў 2026 годзе твораў выяўленчага мастацтва згодна з дзяржаўным сацыяльна-творчым заказам Міністэрства культуры

ПЕРАЛІК
дзіцячых школ мастацтваў, памераў, зместаў твораў выяўленчага мастацтва

| Адміністра-цыйна-тэрыта-рыяльныя адзінкі | Дзіцячыя школы мастацтваў | Памеры твораў выяўленчага мастацтва, (вышыня і шырыня) | Змест твораў выяўленчага мастацтва |
|---|---|---|---|
| **Брэсцкая вобласць** | | | |
| Ганцавіцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Ганцавіцкая дзіцячая школа мастацтваў” | 75x100 см | Беларуская жанчына русавалосая, з доўгай касой, у нацыянальным касцюме, з лірай у руках, на фоне рамонкавага поля і сонца |
| Жабінкаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Жабінкаўская дзіцячая школа мастацтваў” | 80x100 см | Жаночыя вобразы, у стылізаваных беларускіх уборах, якія прымаюць удзел у абрадзе Купалле, на карціне намаляваны карагоднiцы, дзяўчаты з дудой і дудай, у цэнтры прыгажуня ў купальскім вянку з “папараць-кветкай” у руках |
| Лунінецкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Лунінецкая дзіцячая школа мастацтваў” | 60x80 см | Вобраз беларускай жанчыны-натхняльніцы талентаў (можна адлюстраваць жанчыну, якая сядзіць за раялем) |
| Пінскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Лагішынская дзіцячая школа | 80x100 см | Дзяўчына, якая грае на цымбалах на фоне пшанічнага поля з васількамі, неба і бусла |

| Віцебская вобласць | | | |
|---|---|---|---|
| Дубровенскі раён | Дзяржаўная установа адукацыі ”Дубровенская дзіцячая школа мастацтваў імя Фарыда Яруліна“ | 120x90 см | Апісанне карціны: “Лялька Дубравушка” – брэнд Дубровенскага раёна, з’яўляецца ўвасабленнем аўтэнтычнай жаночай прыгажосці. У цэнтры палатна, увасабляючы гаспадыню Дубровенскай зямлі, ва ўвесь рост стаіць маладая жанчына ў самабытным абліччы Дубровенскага строю. На галаве – намітка, якая акуратна апраўляе твар, спадаючы доўгімі канцамі на плечы. У руках яна трымае Марачоўскую гліняную свістульку архаічнай абцякальнай формы. Фон: Маляўнічы краявід з квітнеючымі льнянымі палямі. На далёкім плане мякка выгінаецца паўнаводны Дняпро акружаны магутнымі дубравамі, якія далі імя лялькі Дубравушцы. Неба заліта цёплым перадзакатным ці світальным залацістым святлом. Тэхніка жывапісу: акварэль |
| Ушацкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Ушацкая дзіцячая школа мастацтваў імя Дзям’яна Уладзіміравіча Крупені“ | 100x80 см | Адлюстроўвае жытнёвае поле з краем леса ў далечыне, а на пярэднім плане жанчына з букетам палявых кветак (валошкі, рамонкі, каласы) |
| Браслаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Відзаўская дзіцячая школа мастацтваў“ | 100x60 см | Год беларускай жанчыны. Сімвал натхнення |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Талачынскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Талачынская дзіцячая школа мастацтваў“ | 100х130 см | Тэхніка: алей альбо акварэль па матывах верша ураджэнкі Талачынскага раёна Веры Вярбы (Гертруды Сакаловай) ”Ручнікі“ |
| **Гомельская вобласць** | | | |
| Калінкавіцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Калінкавіцкая дзіцячая музычная школа мастацтваў” | 60х100 см | Музычная тэматыка ў светлых фарбах. Наяўнасць музычных інструментаў і дзяцей |
| Петрыкаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Петрыкаўская дзіцячая школа мастацтваў” | 100х150 см | Год беларускай жанчыны. Беларускі восеньскі пейзаж |
| Светлагорскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Светлагорская дзіцячая школа мастацтваў” | 84,1х59,4 см | Натхняючы вобраз гістарычнай або сучаснай творчай асобы беларускай жанчыны “Жанчына – музыка” |
| Веткаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Веткаўская дзіцячая школа мастацтваў” | 150х200 см | Неглюбскае ткацтва |
| **Гродзенская вобласць** | | | |
| Бераставіцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Бераставіцкая дзіцячая школа мастацтваў” | 100х80 см | Жанчына, якая іграе на саксафоне |
| Дзятлаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Дзятлаўская дзіцячая школа мастацтваў” | 50х50 см | Жанчына, якая іграе на цымбалах |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Свіслацкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Свіслацкая дзіцячая школа мастацтваў” | 60х80 см | Жанчына-мастак |
| Смаргонскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Смаргонская дзіцячая школа мастацтваў імя М.К.Агінскага” | 60х85 см | Жанчына, якая іграе на скрыпцы |
| **Магілёўская вобласць** | | | |
| Быхаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Дзіцячая школа мастацкіх рамёстваў і мастацтваў г.Быхава” | 85х60 см | Выява жанчын-майстроў з прадметам іх рамяства (выраб саламяных павукоў, ткацтва, керамікі і гэтак далей). Адлюстраванне партрэта сучасніц-майстроў, якія адраджаюць рамесныя традыцыі продкаў, беражліва захоўваюць сакрэты рамяства і перадаюць іх наступным пакаленням, што адыгрывае найважную ролю ў выхаванні падрастаючага пакалення ў духу традыцыйных каштоўнасцяў. Да выявы прапануецца партрэт жанчын у традыцыйных касцюмах і галаўных уборах, з прадметамі іх рамяства або ў працэсе вырабу работ |
| Чавускі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Дзіцячая школа выяўленчых мастацтваў і мастацкіх рамёстваў г.Чавусы” | 75х105 см | Партрэт Дынары Смольскай (у дзявоцтве Алімбекавай) – беларускай біятланісткі, заслужанага майстра спорту Рэспублікі Беларусь, ураджэнкі Чавускага раёна* |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Бялыніцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Бялыніцкая дзіцячая школа мастацтваў” | 100х60 см | Жанчына танцуе, побач грае скрыпач, апранутыя ў стылізаваныя беларускія касцюмы |
| Чэрыкаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Чэрыкаўская дзіцячая школа мастацтваў” | 100х150 см | Канцэртнае выступленне жанчыны-музыканта, якая грае на флейце. Яркая канцэртная сукенка, бляск металу флейты ў промнях пражэктараў. На заднім плане могуць быць размешчаны сілуэты іншых музыкантаў альбо сімфанічнага, ці духавога аркестра |
| **Мінская вобласць** | | | |
| Вілейскі раён | Дзяржаўная установа адукацыі “Вілейская дзіцячая школа мастацтваў імя Міхаіла Антонавіча Казінца” | 100х200 см | Жанчына (Вільяна) грае на гуслях. Музыка, якая гучыць, выклікае ва ўяўленні сям’ю буслоў на фоне ракі |
| Клецкі раён | Дзяржаўная установа адукацыі “Клецкая дзіцячая школа мастацтваў” | 130х190 см | “Муза інструментаў” – твор для выявы, дзе жанчына натхняе на стварэнне музыкі. Маладая прыгожая жанчына з доўгімі светлымі хвалістымі валасамі, натхнёны летуценны погляд, грацыёзная пастава. У руках яна трымае старадаўнюю скрыпку, смык дакранаецца струн. Вакол яе параць у паветры іншыя музычныя інструменты: віяланчэль, флейта і арфа, а таксама танцуючыя ноты і срэбраны скрыпічны ключ. Фон – далікатна-блакітнае неба з пухнатымі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | белымі аблокамі. Мяккае разсеяннае асвятленне, адчуванне абсалютнай гармоніі, спакою і натхнення. Пастэльныя тоны, дэталізаваныя мазкі, залатое сячэнне, атмасфера чараўніцтва і прымірэння |
| Капыльскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Капыльская дзіцячая школа мастацтваў” | 2 шт. (дыптых) 90x140 см | Адна частка дыптыха – роля жанчыны і музыкі падчас вайны, другая частка – у цяперашні мірны час. Пажадана выява музычных інструментаў у руках выканаўцаў |
| Пухавіцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Мар’інагорская дзіцячая школа мастацтваў” | 100x150 см | Жанчына-мастак. Сюжэт прысвечаны працэсу стварэння свету, дзе жанчына выступае ў ролі галоўнага дэміурга, які стварае вобраз роднага краю. Кампазіцыя і сюжэт: карціна ў карціне. Жанчына-мастачка са спіны або ў профіль. Яна стаіць перад вялікім палатном на драўляным мальберце. У адной руцэ яна трымае палітру, запоўненую яркімі колерамі (васількавы сіні, рудая зялёная, спелы жоўты, чысты белы), у другой – пэндзаль |
| **г. Мінск** | | | |
| Завадскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 2 імя М.І.Аладава г. Мінска” | 170x100 см | Партрэт Анастасіі Масквіной – народнай артысткі Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, салісткі Вялікага тэатра Беларусі, выпускніцы дзяржаўнай установы адукацыі “Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 2 імя М.І.Аладава г. Мінска”* |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Кастрычніцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 7 г. Мінска" | 100х70 см | Партрэт Алены Віктараўны Атрашкевіч – савецкага і беларускага кампазітара, музычнага педагога, старшыні Беларускага саюза кампазітараў * |
| Ленінскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 6 г. Мінска" | 170х100 см | Партрэт Любанскай (Кяневіч) Ядвігі Геранімаўны (1870 – 1905), белай пані Лошыцкага парка. Любанская Я.Г. – дачка правадыра дваран Мазырскага павета. З 1890 – жонка Яўтафія Іванавіча Любанскага. Займалася дабрачыннасцю. З 1892 г. з'яўлялася членам савета Мінскага дабрачыннага таварыства. З 1902 г. – ганаровая папячыцельніца бясплатнага радзільнага прытулку ў г.Мінску. |

* З яе згоды на падставе прадстаўленага фотаздымку.

Дадатак 2
да Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу на стварэнне ў 2026 годзе твораў выяўленчага мастацтва згодна з дзяржаўным сацыяльна-творчым заказам Міністэрства культуры

Форма

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

______________________________

______________________________
(прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца)

______________________________
ўдзельніка конкурсу, нумар кантактнага тэлефона)

ЗАЯЎКА
на ўдзел у конкурсе на стварэнне ў 2026 годзе твораў выяўленчага мастацтва згодна з дзяржаўным сацыяльна-творчым заказам Міністэрства культуры

Прашу ўключыць мяне ў спіс удзельнікаў конкурсу на стварэнне ў 2026 годзе твораў выяўленчага мастацтва згодна з дзяржаўным сацыяльна-творчым заказам Міністэрства культуры.

Эскіз адпавядае зместу твора для ______________________________
(указваецца дзіцячая школа мастацтваў

______________________________
у адпаведнасці з пералікам дзіцячых школ мастацтваў, памераў, зместаў твораў

______________________________
выяўленчага мастацтва)

Паведамляю, што з’яўляюся аўтарам эскіза, які прадстаўлены мной для разгляду на першым этапе конкурсу.

З Палажэннем аб парадку арганізацыі і правядзенні конкурсу на стварэнне ў 2026 годзе твораў выяўленчага мастацтва згодна з дзяржаўным сацыяльна-творчым заказам Міністэрства культуры азнаёмлены.

| | | |
|---|---|---|
| ______________ | ______________ | ______________ |
| (дата) | (подпіс) | (ініцыялы, прозвішча) |